**А.У. Русецкі,**
рэктар універсітэта,
доктар гістарычных навук, прафесар

# Шлях, скіраваны ў будучыню

Падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў на Віцебшчыне бярэ пачатак з 21 лістапада 1910 г. Менавіта ў гэты дзень у губернскім Віцебску быў адкрыты настаўніцкі інстытут – першая на Беларусі навучальная ўстанова такога тыпу. Для гараджан і асабліва навуковай і творчай інтэлігенцыі гэта была сапраўдная перамога над сталічнымі чыноўнікамі, якія лічылі, што адукацыя "Северо-Западному краю" не патрэбна. (Заўважым аднак, што прагрэсіўныя сілы і пасля адкрыцця інстытута не пакінулі намаганняў, каб у Віцебску быў універсітэт. Як сведчыць віцебскі краязнаўца А.Падліпскі, іх намаганні далі свой плён: у лютым 1917 г. Віцебская гарадская дума прыняла рашэнне аб адкрыцці ў Віцебску універсітэта. Але тут свае карэктывы ўнеслі падзеі 1917 года...)

Аднак вернемся ў 1910 год. Першымі слухачамі настаўніцкага інстытута сталі выпускнікі пачатковых настаўніцкіх вучылішч (чымсьці падобныя на педвучылішчы першых савецкіх часоў), а таксама юнакі (аказваецца і ў той час існавала праблема "яго" ў вучнёўскай аўдыторыі), якія закончылі настаўніцкія семінарыі. З 1910 па 1918 гг. інстытут падрыхтаваў каля 200 настаўнікаў. Па рашэнню Усерасійскага з'езда прадстаўнікоў настаўніцкіх інстытутаў (май, 1918 г.) Віцебскі настаўніцкі інстытут 1 кастрычніка гэтага ж года быў пераўтвораны ў вышэйшую навучальную ўстанову – педагагічны інстытут. Ён стаў першай навучальнай установай Беларусі паслякастрычніцкага перыяду і першай вышэйшай педагагічнай установай рэспублікі.

Рэтраспектыўны погляд на гісторыю нашай ВНУ заўважае не толькі доўгі, але і драматычны, нават трагічны шлях. Успомнім хоць бы рэфармацыі – толькі пачаўся 1919 г., а ўжо з'яўляецца новая назва "Інстытут народнай адукацыі"; у 1921 г. – гэта "Практычны інстытут народнай адукацыі"; у 1923 г. – інстытут аб'яднаны з Беларускім дзяржаўным універсітэтам (да гэтага часу ўстанова развівалася ў межах Расійскай федэрацыі); у 1930 г. зноў адноўлены, як самастойная ўстанова з назвай "Віцебскі індустрыяльна-педагагічны інстытут"; з 1933 г. – гэта Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут (у снежні 1934 г. яму прысвоена імя С.М. Кірава). Дарэчы, з 1935 да 1953 гг. пры нашай ВНУ працаваў настаўніцкі інстытут па падрыхтоўцы настаўнікаў для школ-семігодак.

Рэарганізацыі не закончыліся з вайной, былі яны і потым... Але ўсё ж вернемся да людзей, якія тварылі гісторыю універсітэта ў тыя далёкія часы. Сёння не толькі ўспомнім, але і аддадзім даніну павагі выдатнаму гісторыку-краязнаўцу прафесару Сапунову Аляксею Парфёнавічу, вядомаму рускаму і савецкаму літаратуразнаўцу Бахціну Міхаілу Міхайлавічу, заслужаным дзеячам навукі БССР Ніканаву Леаніду Мікалаевічу і Корбату Ігару Міхайлавічу, заснавальніку Віцебскага батанічнага сада Нікольскаму Л.Д. і многім іншым.

Часовая акупацыя тэрыторыі Беларусі нямецка-фашысцкімі захопнікамі перапыніла плённую працу інстытута. Большасць выкладчыкаў і студэнтаў змагаліся з фашыстамі ў Чырвонай Арміі, падполлі і партызанскіх атрадах.

Тры выпускнікі інстытута – П.М. Машэраў, К.А. Абазоўскі, М.А. Высагорац за мужнасць і гераізм былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Пасля вызвалення Віцебска ад фашысцкіх захопнікаў інстытут пачаў работу ў складзе даваенных факультэтаў (у 1955 г. гістарычны факультэт чамусьці быў перададзены Магілёўскаму педагагічнаму інстытуту). Станаўленне нашай ВНУ ішло хуткімі тэмпамі – у 1957 г. быў адкрыты факультэт пачатковых класаў; у 1959 г. – мастацка-графічны факультэт (на базе Віцебскага мастацка-графічнага вучылішча); у гэтым жа,1959 г., інстытуту перададзены два курсы фізіка-матэматычнага факультэта Полацкага педінстытута; у 1974 г. створаны філалагічны факультэт, з якога ў 1992 г. выдзеліўся самастойны факультэт беларускай філалогіі і гісторыі; у 1978 г. адкрыты факультэт фізічнай культуры і спорту; у 1988 г. – факультэт педагогікі і методыкі пачатковага навучання з дадатковай спецыяльнасцю "выяўленчае мастацтва і музыка" (зараз гэта музычна-мастацкі факультэт); з 1991 г. працуе факультэт дашкольнага выхавання (у 1997 г. пераўтвораны ў факультэт сацыяльнай педагогікі і практычнай псіхалогіі); у апошні час ва універсітэце створаны два новыя падраздзяленні – факультэт даўніверсітэцкай падрыхтоўкі і факультэт перападрыхтоўкі кадраў і павышэння кваліфікацыі.

Восенню гэтага года калектыў універсітэта нечакана папоўніўся вялікай колькасцю студэнтаў і выкладчыкаў, якія перайшлі да нас з Віцебскага філіяла Недзяржаўнага Інстытута сучасных ведаў. Гэты своеасаблівы падарунак лёсу прывёў да з'яўлення ва універсітэце такой прэстыжнай спецыяльнасці, як правазнаўства (Праўда, тут пакуль што пераважае платная форма навучання. Але мы мяркуем, што з цягам часу ўсё выраўняецца і набор студэнтаў будзем рабіць як на пазабюджэтную, так і на бюджэтную формы навучання). Адкрыццё правазнаўства – гэта не вырашэнне нейкай самамэты. Гэта важкі крок да пераўтварэння універсітэта, у якім пакуль што вядучымі з'яўляюцца педагагічныя прафесіі, ва універсітэт класічнага тыпу з наборам неабходных для такой установы спецыяльнасцей і спецыялізацый.

Аднак зноў жа звернемся да гісторыі. З 1 верасня 1995 г. нашай навучальнай установе па рашэнню Калегіі Міністэрства адукацыі і навукі прыдадзены універсітэцкі статус, а ў лютым 1998 г. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі універсітэту прысвоена імя нашага выпускніка, вядомага дзеяча Беларусі П.М. Машэрава.

Урэшце – выніковыя лічбы. Свой 80-гадовы юбілей універсітэт сустракае з трыма аддзяленнямі – стацыянарным, завочным і вячэрнім; 13 факультэтамі, 39 кафедрамі. Студэнтамі універсітэта з'яўляюцца 5,5 тыс. чалавек, з іх больш за 3,5 тыс. вучыцца на дзённым аддзяленні. Падрыхтоўку спецыялістаў ажыццяўляюць каля 450 выкладчыкаў, з якіх 225 маюць вучоныя ступені і званні, у тым ліку 22 дактары навук ці прафесары, 10 членаў Саюза мастакоў Беларусі, 3 члены Саюза пісьменнікаў.

Ва універсітэце створана сістэма бесперапыннай шматузроўневай падрыхтоўкі педагагічных кадраў, заснаваная на прафарыентацыйнай рабоце з агульнаадукацыйнымі школамі, каледжамі, гімназіямі. Для прафарыентацыі сельскай моладзі адкрыта школа будучага студэнта, у якой у мінулым навучальным годзе займалася 912 чалавек.

Ва універсітэце працуюць аспірантура і магістратура, Савет па абароне кандыдацкіх дысертацый па спецыяльнасцях 13.00.01 – агульная педагогіка; 13.00.02 – методыка выкладання чарчэння, выяўленчага мастацтва, працоўнага навучання; ёсць чатыры вучэбныя корпусы, пяць інтэрнатаў, батанічны сад, база палявых практык, сем спартыўных залаў, спартыўна-аздараўляльны лагер, вылічальны і тэлевізійны цэнтры, выдавецтва. Функцыянуюць 5 музеяў, у тым ліку музей двойчы Героя, выпускніка

Віцебскага педагагічнага інстытута П.М. Машэрава. Музею гісторыі універсітэта прысвоена ганаровае званне "народны".

Ёсць значныя набыткі ў навуковай рабоце. Напрыклад, з 1995 г. рэалізуецца рэгіянальная комплексная навукова-тэхнічная праграма "Беларускае Паазер'е: прыродныя рэсурсы, матэрыяльная і духоўная культура", мэтай якой з'яўляецца навуковая распрацоўка важных для паўночнага рэгіёна Беларусі праблем прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя, гісторыі і філасофіі, мовазнаўства і літаратуразнаўства, адукацыі і выхавання, народнай творчасці.

Новыя, самыя перспектыўныя навуковыя напрамкі па механіцы дэфармаванага цвёрдага цела, па атамнай спектраскапіі, а таксама па распазнаванню вобразаў і аўтаматычнаму кіраванню складанаэнергетычнымі працэсамі атрымалі шырокую падтрымку вучоных нашай рэспублікі.

Вучоныя-фізікі і хімікі універсітэта распрацавалі новыя ўзоры сегнетаэлектрычных матэрыялаў і паст для металізацыі лакафарбавых кампазіцый і эмаляў, якія прымяняюцца ў радыётэхнічнай і прыборабудаўнічай прамысловасці і абаронены аўтарскім пасведчаннем.

Безумоўна, вучоныя універсітэта не стаяць у баку ад вывучэння гісторыі, культуры і традыцый беларускага народа. Шырока даследуюцца метады народнай педагогікі і магчымасці іх выкарыстання ў навучальна-выхаваўчым працэсе. Фальклорная лабараторыя актыўна збірае і вядзе картатэку беларускай вуснай народнай творчасці.

Трэба адзначыць актыўнасць педагогаў па ажыццяўленню традыцый Віцебскай мастацкай школы, узнаўленню мастацтва эстампа, традыцый акварэльнага жывапісу.

Актыўна вядзецца работа па станаўленню школы апрацоўкі дрэва, народнай вышыўкі, ткацтва. Вучоныя-выкладчыкі універсітэта стварылі шэраг навуковых прац па гісторыі фальклора, народных мастацкіх промыслаў на Беларусі, па гісторыі Віцебскай мастацкай школы, прымаюць актыўны ўдзел у такіх значных міжнародных культурна-навуковых мерапрыемствах, як "Шагалаўскі пленэр", "Малевічскі пленэр", пленэр І.Хруцкага, "Шагалаўскія чытанні", "Бахцінскія чытанні" і інш.

Ва універсітэце склаліся навукова-педагагічныя школы па матэматыцы, біялогіі, графічнай падрыхтоўцы школьнікаў і студэнтаў, мастацтвазнаўству. У апошнія гады інтэнсіўна пачалі фарміравацца навуковыя школы філолагаў, культуролагаў, школа па вывучэнню этнапедагогікі і інш.

У 1997 г. навуковыя даследаванні вяліся па 52 дзяржбюджэтных і 4 гаспадарча-разліковых тэмах. Шэраг тэм уключаны ў Комплексную праграму важнейшых даследаванняў Рэспублікі Беларусь, 7 тэм прайшлі конкурс Міністэрства адукацыі на бюджэтнае фінансаванне.

Універсітэт стаў цэнтрам правядзення многіх міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных канферэнцый. Развіваюцца міжнародныя сувязі, падпісаны дагаворы аб супрацоўніцтве з Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам імя М.В. Ламаносава, Маскоўскім дзяржаўным педагагічным універсітэтам, Санкт-Пецярбургскім універсітэтам, Інстытутам гісторыі матэрыяльнай культуры РАН, Даўгаўпілскім педагагічным універсітэтам (Латвія), Беластоцкім філіялам Варшаўскага універсітэта і Зеленагурскай вышэйшай педагагічнай школай імя Т.Катарбінскага (Польшча), рэгіянальным каледжам Летэркені (Паўночная Ірландыя), наладжаны кантакты з Ціраспальскім дзяржаўным універсітэтам. Умацоўваюцца сувязі са школамі і органамі адукацыі, установамі культуры, прадпрыемствамі вобласці.

На выдавецкай базе універсітэта друкуецца навуковы часопіс "Веснік

Віцебскага дзяржаўнага універсітэта", вучэбныя дапаможнікі і метадычныя рэкамендацыі, пачата падрыхтоўка серыі новых праграм па асноўных дысцыплінах.

З 1992 г. у выдавецтве універсітэта выходзіць часопіс "Дыялог. Карнавал. Хранатоп", прысвечаны вывучэнню сусветна вядомага перыяду віцебскага рэнесансу 1910-1930 гг. і навуковай спадчыны М.М. Бахціна. Членамі рэдакцыйнай калегіі журнала з'яўляюцца аўтарытэтныя вучоныя ЗША, Германіі, Аўстрыі, Японіі, Канады, Велікабрытаніі і краін СНД. Гэта адно з тых пачынанняў, якія выводзяць універсітэт на арбіту знакамітых і аўтарытэтных міжнародных культурных праграм.

Нельга не адзначыць, што за час свайго існавання універсітэт падрыхтаваў мноства спецыялістаў, якія плённа працуюць на ніве адукацыі і культуры, у многіх арганізацыях і ўстановах Беларусі, краін СНД. У ліку выпускнікоў 165 вучоных, з іх 23 дактары навук і прафесары, 2 члены-карэспандэнты, 3 акадэмікі. Сярод іх больш 150 маюць ганаровыя званні СССР, БССР, Рэспублікі Беларусь. На сённяшні дзень каля 130 выпускнікоў працуюць выкладчыкамі ва універсітэце, 80 з іх абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

Сярод выпускнікоў універсітэта – удзельнікі Алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету і Еўропы. Найбольш значных поспехаў дасягнулі: майстар спорту В. Яноўскі – чэмпіён Сеульскай алімпіяды па боксу; заслужаны майстар спорту па гімнастыцы А. Туміловіч – чэмпіён свету ў камандных спаборніцтвах і бронзавы прызёр у асабістых; заслужаны майстар спорту па барацьбе І.Каныгін – чэмпіён свету, сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў. Сёння 24 студэнты універсітэта з'яўляюцца членамі нацыянальнай зборнай каманды Рэспублікі Беларусь па розных відах спорту, 5 чалавек удзельнічалі ў апошняй Алімпіядзе.

Адукацыйныя традыцыі і назапашаны вопыт актыўна выкарыстоўваюцца для вырашэння асноўнай задачы – пераўтварэння ВНУ з педагагічнага інстытута ў класічны універсітэт. Побач з існуючымі адкрываюцца новыя спецыяльнасці. У сувязі з увядзеннем новых спецыяльнасцей ствараюцца новыя кафедры – тэарэтычнай фізікі, псіхалогіі і карэкцыйнай работы, сацыяльнай работы, усеагульнай гісторыі і сусветнай культуры, начартальнай геаметрыі, прыкладной матэматыкі і механікі, замежных моў і інш.

Зроблена немала. Але гэта – гісторыя. Галоўнае, што зробім заўтра? Таму перад калектывам была і застаецца звышзадача – зрабіць Віцебскі дзяржуніверсітэт імя П.М. Машэрава вядучым адукацыйным, навуковым і культурным цэнтрам паўночнай Беларусі. Будзе цяжка. Але што зробіш, калі такі абраны шлях, калі ёсць мэта, якая прыцягвае, вядзе і будзе весці па нязведаных пуцінах жыцця і навукі.